*Мікалаева Л. В.*
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі», Мінск

*Mikalayeva L.*
Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk

**УДК 930(438)**

# ПОГЛЯД НА МАСКОЎСКА-ЛІТОЎСКІЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ КАНФЛІКТЫ Ў КАНЦЫ XIV – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI СТАГОДДЗЯ Ў ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ XIX СТАГОДДЗЯ

# A LOOK AT THE MOSCOW-LITHUANIAN POLITICAL CONFLICTS AT THE END OF THE XIV – THE FIRST HALF OF THE XVI CENTURY IN POLISH HISTORIOGRAPHY OF THE XIX CENTURY

*У артыкуле аналізуюцца ключавыя даследаванні польскіх гісторыкаў XIX ст., у якіх быў прадстаўлены поглад на спецыфіку палітычных канфліктаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім у канцы XIV – першай палове XVI ст. Робіцца вывад, што ўсходні напрамак знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага разглядаўся ў польскай гістарыяграфіі XIX ст. скрозь прызму існаваўшай з 1385 г. польска-літоўскай уніі. Гэта ўплывала на ацэнку польскімі даследчыкамі падзей у ходзе шматлікіх маскоўска-літоўскіх палітычных канфліктаў, якія з канца XV ст. прывялі да пяці войнаў паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і Вялікім Княствам Літоўскім і значных страт тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае; Вялікае Княства Маскоўскае; адносіны; супярэчнасці; палітычныя канфлікты.*

*The article analyzes key studies of Polish historians of the XIX century, which presented a look at the specifics of political conflicts between the Grand Duchy of Lithuania and the Grand Duchy of Moscow at the end of the XIVth – first half of the XVIth centuries. It is concluded that the eastern direction of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania was considered in Polish historiography of the XIXth century. through the prism of the Polish-Lithuanian union that existed since 1385. This influenced the assessment by Polish researchers of the events during the numerous Moscow-*

*Lithuanian political conflicts, which since the end of the XV century. led to five wars between the Grand Duchy of Moscow and the Grand Duchy of Lithuania and significant losses of the territory of the Grand Duchy of Lithuania.*

*Keywords: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania; the Grand Duchy of Moscow; relations; contradictions; political conflicts.*

Геапалітычныя змены, якія адбываліся ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ў канцы эпохі Сярэднявечча і ў пачатку Новага часу, паўплывалі як на ўнутрыпалітычнае развіццё дзяржаў гэтага рэгіёна, так і на ўзаемаадносіны паміж імі. Вядучымі суб'ектамі міжнародных адносін тут з'яўляліся Вялікае Княства Літоўскае (далей – ВКЛ) і Вялікае Княства Маскоўскае (далей – ВКМ).

ВКЛ, прайшоўшы праз пакуты грамадзянскай вайны 1386–1392 гг., зведала працэс пэўнай цэнтралізацыі і дасягнула найбольшай магутнасці ў час кіравання вялікага князя Вітаўта (1392–1430). Аднак пасля смерці апошняга ўнутрыпалітычны крызіс 30-х гг. XV ст. і свядомая адмова вялікага князя літоўскага Казіміра (1440–1492), які з 1445 г. адначасова з'яўляўся і польскім каралём, ад актыўнай палітыкі на ўсходнім вектары знешнепалітычных дачыненняў ВКЛ заклалі падмурак для страты дзяржавай гегеманісцкіх пазіцый у рэгіёне.

ВКМ, сапернік ВКЛ у збіранні «рускіх» зямель, значна палепшыла свае пазіцыі. Пасля заканчэння міжусобнай барацьбы, якая вялася паміж нашчадкамі князя Дзмітрыя Данскога ў 1425–1453 гг. за вялікакняжацкі трон у Маскве, унутрыпалітычная сітуацыя ў дзяржаве набыла стабільнасць. Уступленне на прастол у 1462 г. вялікага князя Івана III без ярлыка ардынскіх ханаў прадвызначылі яго дзейнасць па ліквідацыі залежнасці ВКМ ад Арды і аб'яднанні вакол Масквы іншых княстваў Паўночна-Усходняй Русі (Яраслаў, Ноўгарад, Цвер і інш.). ВКМ паступова пераўтваралася з невялікага ўдзельнага княства ў магутную дзяржаву, межы якой у канцы XV ст. усутык падыйшлі да граніц ВКЛ. Палітычныя канфлікты паміж дзвюма вядучымі краінамі рэгіёна за ўплыў і валоданне «рускімі» землямі дасягнулі піка і перайшлі ў ваенную стадыю. З пяці войнаў, якія вяліся паміж ВКМ і ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст., чатыры былі ініцыяваныя маскоўскімі валадарамі. Няўдачы ў войнах і страта значнай часткі тэрыторыі ВКЛ (каля 33 % ад агульнай плошчы) пазбавілі яго пазіцыі рэгіянальнага лідара. Перавага перайшла на бок ВКМ, якое не збіралася спыняцца на дасягнутым, прад'яўляючы ўсё новыя прэтэнзіі на «рускія» землі ВКЛ. Кіраўніцтва апошняга не прызнавала іх законнымі і спрабавала кампенсаваць ваенныя няўдачы

актывізацыяй палітычных і ідэалагічных сродкаў і метадаў уздзеяння на саперніка.

Азначаныя акалічнасці не засталіся па-за ўвагай польскіх даследчыкаў XIX ст. Падзелы Рэчы Паспалітай канца XVIII ст. прадвызначылі тую акалічнасць, што ў XIX ст. польскія гісторыкі працавалі ў межах розных краін, грамадска-палітычныя рэаліі якіх аказвалі ўплыў не толькі на ўмовы іх дзейнасці, але і на атрымліваемыя вынікі. Характэрнай асаблівасцю поглядаў значнай часткі полькіх гісторыкаў XIX ст. быў разгляд знешнепалітычных праблем ВКЛ скрозь прызму існаваўшай польска-літоўскай уніі і ўспрыманне гэтай дзяржавы як польскай правінцыі. У цэлым у польскай гістарыяграфіі XIX ст. можна вылучыць некалькі школ, прадстаўнікі якіх звярталіся да праблематыкі адносін ВКЛ з ВКМ у канцы XIV – першай палове XVI ст.

Першыя спробы комплекснага навуковага падыхода да разгляду праблемы ўзаемаадносін ВКЛ з ВКМ былі прадпрыняты ў польскай гістарычнай навуцы «бацькам польскай рамантычнай гістарыяграфіі» і заснавальнікам так званай «лялевелеўскай» гістарыяграфічнай школы Іаахімам Лялевелем (1786–1861), аўтарам шэрагу прац па палітычнай гісторыі Польшчы і ВКЛ. Выпускнік, а пазней нейкі час прафесар Віленскага ўніверсітэта, адзін з кіраўнікоў паўстання 1830–1831 гг., старшыня Патрыятычнага таварыства, вымушаны выехаць у Францыю пасля паражэння паўстання, І. Лялевель стаў знакавай фігурай у развіцці польскай гістарычнай думкі XIX ст. У яго творчасці супярэчліва спалучаліся дэмакратычныя погляды з пэўнай ідэалізацыяй ладу шляхецкай дэмакратыі перыяду Рэчы Паспалітай. Знаходзячыся ў эміграцыі, І. Лялевель напісаў адмысловую па сваёй праблематыцы працу «Dzieje Litwy i Rusi aż do unji z Polską w Lublinie 1569 zawartej», якая пабачыла свет у Познані ў 1844 г. [1]. У ёй аўтар ажыцявіў спробу адлюстравання гісторыі Русі і Літвы ад часоў Кіеўскай Русі да Люблінскай уніі, упершыню зрабіўшы аб'ектам даследавання гістарычнае мінулае асноўных складовых частак ВКЛ, паказаўшы ўзаемасувязь працэсаў, што адбываліся на іх тэрыторыях. Не засталася па-за ўвагай даследчыка і тая частка Русі, што не ўвайшла ў склад ВКЛ. У сувязі з гэтам важнае месца ў працы заняло асвятленне ўзаемаадносін паміж ВКЛ і ВКМ. У даследаванні гісторык абапіраўся на шырокую базу крыніц, у тым ліку польскіх, якія да даследавання гісторыі ВКМ прыцягваліся І. Лялевелем упершыню.

Дзякуючы перавазе ў польскім нацыянальна-вызваленчым руху дэмакратычных элементаў, школа І. Лялевеля больш чым на два дзе-

сяцігоддзі заняла пануючае становішча ў польскай гістарыяграфіі і ўтрымлівала яго аж да часоў паражэння паўстання 1863–1864 гг. Ажыццёўленыя І. Лялевелем і яго паслядоўнікам Анджэем Марачэўскім (1802–1855) спробы абагульнення ўсяго гістарычнага вопыта мінулага і выкліканая імі палеміка сталі значным фактарам ў развіцці польскай гістарычнай думкі.

Асноўнымі ў польскай гістарыяграфіі другой паловы XIX ст. былі дзве пазітывісцкія школы: кракаўская і варшаўская. Іх дзейнасць развівалася ў розных умовах.

Кракаўская гістарыяграфічная школа, вядучымі прадстаўнікамі якой былі Валерыян Калінка (1826–1886), Юзаф Шуйскі (1835–1883), Міхал Бабжыньскі (1849–1935), Станіслаў Смолька (1854–1924), склалася на той частцы зямель Рэчы Паспалітай, якая пасля падзелаў апошняй увайшла у склад Аўстрыі. Ва ўмовах эвалюцыі Аўстра-Венгерскай манархіі з мэтай аслаблення нацыянальна-вызваленчага руху ўлады імперыі ў 1860-х гг. прадставілі гэтай частцы дзяржавы аўтаномію. Тут дзейнічалі ўніверсітэты ў Кракаве і Львове, гістарычныя кафедры якіх рыхтавалі кадры даследчыкаў. У 1871 г. у Кракаве пачала дзейнасць Акадэмія ведаў. Заснаваная пры ёй гістарычная камісія займалася зборам і выданнем гістарычных крыніц, зборнікаў, манаграфій. Прадстаўнікі кракаўскай школы былі цесна звязаны з кіруючымі коламі Аўстра-Венгрыі і займаліся пераважна даследаваннямі ў галіне палітычнай гісторыі.

У цеснай сувязі і пад уплывам кракаўскай школы знаходзілася львоўская гістарыяграфічная школа, заснавальнік якой Ксаверый Ліске (1838–1891) з 1887 г. стаў фундатарам буйнога гістарычнага часопіса «Kwartalnik historyczny», які доўгі час быў адзіным польскім гістарычным друкаваным органам.

Дзейнасць варшаўскай школы, вядучымі прадстаўнікамі якой былі Тадэвуш Корзан (1839–1918) і Уладзіслаў Смаленьскі (1851–1926), разгортвалася на тэрыторыі Царства Польскага ў складзе Расійскай імперыі. Пасля падаўлення паўстання 1863–1964 гг. царскія ўлады зачынілі тут усе вышэйшыя навучальныя ўстановы, забаранілі дзейнасць гістарычных таварystваў, выданне гістарычных часопісаў і г. д. Праца вучоных фінансавалася у асноўным за кошт прыватных ахвяраванняў. Праблематыка гістарычных даследаванняў варшаўскай школы побач з палітычнай гісторыяй уключала сацыяльна-эканамічныя і культурныя аспекты.

У 1862 г. выйшла з друку кніга прадстаўніка кракаўскай гістарыяграфічнай школы Ю. Шуйскага, напісаная на аснове польскіх крыніц [2]. Пры выкладанні матэрыяла перавага ў ёй была нададзена пытанням стасункаў ВКЛ з Польшчай. Палітычныя і ваенныя канфлікты ВКЛ з ВКМ у працы былі разгледжаны не вельмі глыбока і дастаткова схематычна. Ю. Шуйскі бясспрэчна палемізаваў з меркаваннямі расійскіх гісторыкаў, у прыватнасці з даследаванем М. М. Карамзіна «История государства Российского» [3]. Так, калі рускі гісторык сур'ёзна адносіўся да заяў вялікага князя маскоўскага Івана III пра рэлігійную матывацыю (абарона правоў праваслаўных у ВКЛ) пачатку вайны паміж ВКМ і ВКЛ 1500 г., то Ю. Шуйскі палічыў такія падставы надуманымі, закліканымі апраўдаць захопніцкія дзеянні маскоўскага вялікага князя. Прычынамі страты Смаленска ў 1514 г. Ю. Шуйскі ўслед за польскім храністамі XVI ст. называў здраду гарнізона і інтрыгі князя М. Глінскага, а не пачуцці сімпатыі смаленчукоў да вялікага князя маскоўскага Васіля III і сваіх адзінаверцаў, яго праваслаўных падданых [2, s. 124, 180]. У цэлым погляды Ю. Шуйскага былі выразна антымаскоўскія.

Яшчэ адзін прадстаўнік гэтай гістарыяграфічнай школы, прафесар Кракаўскага ўніверсітэта М. Бабжыньскі, прапагандаваў цывілізатарскую місію Польшчы на ўсходзе [4]. Прычыны пачатку маскоўска-літоўскіх войнаў ён бачыў у агульнай мэце – аб'яднанні «рускіх» зямель, але ў супрацьлеглых інтэнцыях ВКЛ і ВКМ. Калі маскоўскія валадары, на яго погляд, стваралі з Руссю асобнае, адналітае, праваслаўнае цэлае, то ВКЛ разам з Польшчай, якая яго падтрымлівала, збліжала падначаленыя яму рускія землі з каталіцкім захадам і «пашырала ў іх асіміяцыйны ўплыў польскай цывілізацыі» [4, s. 235]. У такіх умовах непазбежным станавілася ваеннае сутыкненне паміж сапернікамі. І нават шлюб вялікага князя літоўскага Аляксандра з маскоўскай князёўнай Аленай не забяспечыў спакой паміж дзяржавамі [4, s. 236]. Пры Жыгімонце Старым маскоўскія валадары не адмовіліся ад плана авалодаць усёй Руссю, а славутая перамога пад Оршай у 1514 г. не здолела вярнуць Смаленск, захоплены ў тым жа годзе падданымі Васіля III. Апошняга падрымліваў добрымі парадамі перайшоўшы на яго службу князь М. Глінскі, абражаны няласкай караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Старога [4, s. 247]. Як бачым, для працы М. Бабжыньскага быў уласцівы досыць рэалістычны погляд на мінулае, хаця ўсходнюю мяжу Польшчы ён атаясамліваў з усходняй мяжой ВКЛ

і ацэньваў знешнепалітычныя крокі апошняга з пункту гледжання выгаднасці ці нявыгаднасці іх для Польшчы.

Між тым трэба адзначыць, што найбольш сур'ёзнае сістэматычнае, хаця і не закончанае, даследаванне па гісторыі Польшчы і ВКЛ выйшла не з-пад пяра кракаўскіх аўтараў, якія мелі магчымасць выкарыстаць непасрэдна багацейшы ўласна польскі гістарычны матэрыял, а стала вынікам працы нямецкага гісторыка яўрэйскага паходжання, ураджэнца Гнезна Я. Каро (1835–1904) [5].

Здабыткам варшаўскай гістарыяграфічнай школы стала фармуліроўка так званай «ягелонскай ідэі», якая мела на ўвазе стварэнне польскай федэратыўнай дзяржавы шляхам засваення тэрыторый на ўсход ад Польшчы (сучасныя Літва, Беларусь, Украіна), цывілізатарскую місію ўвядзення ўсходніх ускраін у лона еўрапейскай культуры і жорсткае супрацьстаянне з Масквой. Упершыню тэрмін «ягелонская ідэя» быў уведзены ў навуковы зварот Феліксам Канечным (1862–1949), аўтарам працы «Jagiełło i Witołd (1382–1392)» [6], прысвечанай перыпетыям барацьбы за ўладу ў ВКЛ паміж гэтымі палітычнымі лідарамі. Пэўная ўвага ў гэтай працы нададзена і пазіцыі ВКМ у адносінах да ўдзельнікаў гэтага канфлікта.

Такім чынам, адной з характэрных рыс і адным з галоўных недахопаў вялікай часткі польскай гістарыяграфіі XIX ст. быў погляд на маскоўска-літоўскія палітычныя канфлікты ў канцы XIV – першай палове XVI ст. праз прызму існаваўшай з 1385 г. польска-літоўскай уніі. У выніку польскія даследчыкі не разглядалі ці не бралі ў разлік ВКЛ як самастойны суб'ект знешняй палітыкі, ствараючы для яго вобраз правінцыі Польшчы. Гэта ўплывала на ацэнкі польскімі даследчыкамі шматлікіх маскоўска-літоўскіх палітычных канфліктаў, прывёўшых да ваенных сутыкненняў і страты значнай часткі тэрыторыі ВКЛ.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Lelewel, J.* Dzieje Litwy i Rusi aż do unji z Polską w Lublinie 1569 zawartej / J. Lelewel. – Poznań: Nakładem i drukiem W. Stefańskiego, 1844. – 202 s.; *Lelewel, J.* Dzieła / J. Lelewel. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1969. – T. 10: Dzieje Litwy i Rusi aż do unji z Polską w Lublinie 1569 zawartej; oprac.: J. Ochmański. – 254, [4] s.

2. *Szujski, J.* Dzieje Polski podług ostatnich badań spisane przez Józefa Szujskiego / J. Szujski. – Lwów: Nakładem Karola Wilda, 1862. – T. 2: Jagielloni. – 340 s.

3. *Карамзин, Н. М.* История государства Российского: Репринтное воспроизведение издания 1842–1844 гг. в трех книгах с приложением/ Н. М. Карамзин. – М.: Книга, 1989. – Кн. 2. – Т. V – VIII. – 242, 228, 142, 188 стлб.

4. *Bobrzyński, M.* Dzieje Polski w zarysie / M. Bobrzyński. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1879. – 495 s.

5. *Caro, J.* Geschichte Polens/ J. Caro. – Gotha: Perthes, 1886. – Bd. 5. H. 1. 1455 – 1480. – XIII, 500 s.; *Caro, J.* Dzieje Polski / J. Caro; przelozył z języka niemieckiego S. Mięczyński. – Warszawa: Skład głowny w księgarni E.Wendego i spółki, 1900. – T. 6: 1481–1506. – 431 s.

6. *Koneczny, F.* Jagiełło i Witołd (1382 – 1392) / F. Koneczny // Przewodnik naukowy i literacki. – 1892. – R. XX. – T. XX. – Z. I. Styczen. – S.1 – 1096.

**(Дата поступления: 26.11.2019).**

*Олейник В. В.*
Учреждение образование «Военная академия Республики Беларусь», Минск

*Oleinik V.*
Military Academy of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 82-94:344 «18/19»**

# МЕМУАРНАЯ ЛИТЕРАТУРА КАК ИСТОЧНИК ДЛЯ ИССЛЕДОВАНИЙ ПО ИСТОРИИ ОРГАНОВ ВОЕННОЙ ЮСТИЦИИ ПОСЛЕДНЕЙ ТРЕТИ XIX – НАЧАЛА XX ВЕКОВ

# MEMOIRS AS A SOURCE FOR HISTORICAL RESEARCH BODIES OF MILITARY JUSTICE OF THE LAST THIRD OF THE XIX – BEGINNING OF XX CENTURIES

*В статье на отдельных примерах мемуарной литературы, авторами которой являются как представители органов российской военной юстиции, проходившие службу в последней трети XIX – начале XX веков, так и их современники из числа соотечественников и иностранцев, раскрывается важность данного источника для изучения истории военно-судебных учреждений Русской императорской армии. Предметом изучения выступают произведения гражданских и военных юристов, а также путешественников из других стран, литературное наследие которых дает обширный материал для формирования целостной картины исследуемого исторического периода.*

*Ключевые слова: мемуарная литература; воспоминания; военная юстиция; Военно-юридическая академия; эмиграция.*